Максім Танк. Паэма “Люцыян Тaполя” (10 клас)

Мэты:

-даследаваць ідэйны і мастацкі бакі паэмы, паказаць яе сувязь з фальклорам;

-удасканальваць навыкі аналізу паэтычнага твора, засяродзіць увагу на выкарыстанні сродкаў паэтызацыі і гратэску;

-садзейнічаць выхаванню сілы духа, жыццястойкасці перад нягодамі.

## Ход урока

I.Арганізацыйна-матываваны этап (мэта: выклікаць цікавасць да ўрока, актывізаваць пазнаваўчую дзейнасць; выкарыстанне прыёмаў “Асацыяцыі”, “Кластар”)

Настаўнік.

- Якія дрэвы вам больш за ўсё падабаюцца?
- Што ўяўляе сабой дрэва таполя?
- Як вы лічыце, што будзе самым вызначальным у дрэве?

Кластар “Таполя”

пух

высокая тонкая зялёная прыгожая

Настаўнік.

- Як вы лічыце, чаму Максім Танк у якасці назвы узяў імя Люцыян, а ў якасці прозвішча – Таполя?

| Люцыян | | Таполя | |
|---|---|---|---|
| Паходжанне слова | Лацінскае, ад біблейскага апостала Лукі | Памер | Вышыня 30-40 метраў, тонкая ў дыяметры |
| Значэнне імя | Светлы / свет | Колер | Зялёны, з шэрым адценнем |
| Якасці характару | Пацуццё прыгожага, самаахвяраванне, дабрыня, лідарскія якасці, творчая рэалізацыя; інтраверты | Знешні выгляд | Прыгожае дрэва, у чэрвені пакрываецца белым пухам |
| Дзейнасць | Хрысціянскі святы, іканапісец, урач, юрыст, апякун жывапісцаў, іканапісцаў | Прымяненне | Азеляненне, умацаванне яроў, берагоў рэк і ўзгоркаў |
| Фотаздымак | | Фотаздымак | |

Прагназуемыя адказы: паказаць чалавека, які імкнецца ўверх, да высокага, да прыгожага, да справядлівасці; які не спыняецца ні перад чым у дасягненні сваёй мэты і для якога важна пакінуць след у жыцці, пакінуць нашчадкам свой плён працы.

II. Арыенціровачна-матываваны этап (мэта: абагуліць набытыя веды пра галоўнага героя і сфармуляваць новыя пытанні па характарыстыцы героя,

прымяняючы актыўнае мысленне; прымяняем прыём “Кластар”, сэнсава-лагічныя ланцужкі).

Люцыян Таполя. Хто ён?

Майстар
- будаваў капліцы, крыжы
- выразаў апосталаў
- зрабіў пана свайго Ірадам
- паказаў простых людзей у пастаці анёлаў

Мастак
- цешыліся з цудаў
- рагаталі
- хараство ў постацях
- быццам кніга вырабы

Якія рысы характару будуць вызначальнымі ў таленавітага чалавека?

Адказнасць
Мэтанакіраванасць
Багароб (робіць прыгожа)
Талент на карысць чалавеку

Самародак

III. Кантрольна-карэкцыйны этап (мэта: выявіць узровень разумення зместу твора, уменне аналізаваць, вызначаць ідэю твора, мастацкія сродкі)
Настаўнік.

- Як вы лічыце, чаму апосталы і прарокі былі падобныя да простых людзей?

Алгарытм “Таму што…”

1. Люцыян Таполя бачыў прыгажосць у самым звычайным.
2. Сапраўдны майстар у паўсядзённым бачыць адметнае.
3. Рухаючай сілай грамадства з’яўляюцца людзі, якія сумленна працуюць і прыносяць карысць.
4. Майстэрства служыць народу, людзям, бо народ – творца мастацтва.

- Чаму людзі доўга цешыліся з цудаў? (у вырабах бачылі сваіх аднавяскоўцаў; не верылі, што яны [простыя людзі] могуць быць прыкладам для ўвекавечвання, помнікам)
- З якой мэтай Люцыян Таполя рабіў свае вырабы? ( людзям на карысць; выкрываў тых, хто здзекаваўся з людзей)
- Чаму майстэрства Таполі не спадабалася біскупу Сямашку? Хто такі біскуп? Якія рысы характару павінны быць у духоўнай асобы? Ці стасуюцца рысы характару Сямашкі з рысамі характару духоўнай асобы?

- Якія мастацкія сродкі аўтар выкарыстоўвае, каб паказаць сутнасць характару рэлігійных асоб?
- Які прысуд  вынес біскуп Сямашка Люцыяну Таполі? (10 год адбыць пакуты, 10 год не брацца за майстэрства)
- Як вы лічыце:чалавеку таленавітаму і ўвогуле чалавеку можна пражыць так? Што ў вашым уяўленні 10 год жыцця? (доўгі адрэзак часу, можна закончыць школу, можна паступіць ва ўніверсітэт і закончыць яго, можна нарадзіць дзіця, якому будзе дзесяць гадоў)
- Што мяняецца ў прыродзе за 10 год? ( дрэва дзесяць раз зменіць свой убор зялёны; дзесяць пакаленняў салаўіных выкалыша на сваіх галінах,  дзесяць залатых кругоў адложыць, як пярсцёнкаў)
- Якія змены адбыліся з Л.Таполем за дзесяць год? (пасівеў, шмат пабачыў і бяды і гора; так змяніўся, што ніхто пры сустрэчы не пазнаў)
- Чаму М.Танк параўноўвае змены ў прыродзе і жыцці Л.Таполі  не на карысць чалавеку? (прырода – вечнасць, чалавек – маленькая  істота ў Сусвеце, таму трэба жыць не бяздумна, а пазітыўна, мэтанакіравана, бо час хуткаплынны)

Настаўнік. Мы даказалі, што 10 год для Л.Таполі былі цяжкім часам. А што было мэтай  жыцця яго ў гэты перыяд? (жыў помстай не дараваць біскупу Сямашку і яловаму суку за тое, што перакрэслілі яго жыццё, шкодзілі яго майстэрству, былі ворагамі)

- Як вы лічыце, мэта Люцыяна Таполі жыццесцвярджальная? Ці правільна жыць у сэрцы з помстай?
- Як адпомсціў Л.Таполя за сябе? Якой была яго праца ў гэты час? ( ён нікога не пакрыўдзіў, не забіў, не пакалечыў, а пабудаваў новую святыню, дзе ажывала нават нежывое, немагчымае рабілася магчымым, гнуўся камень, днём і ноччу працаваў, са звычайнай цэглы паўставалі здані, звяры, страхоцце)
- Дык што гэта было – праца ці помста? Які след пакінуў пасля сябе? (можна сказаць, што яго помства была жыццесцвярджальнай, але не на карысць яму; след яго згубіўся недзе, можа, і сто гадоў пражыў, і вучыў людзей майстэрству)
- Ці можна лічыць Л.Таполю шчаслівым чалавекам? З якімі фалькларнымі героямі яго можна параўнаць? Давайце ўспомнім вобраз гусляра з паэмы Я.Купалы. Чым падобныя гэтыя героі? Чым яны жылі? (служылі народу, не прадавалі свой талент; лічылі, што лепш загінуць, чым згубіць у сабе чалавека)
- Якая ідэя твора? (сапраўднае мастацтва служыць народу; сапраўдны мастак, таленавіты чалавек павінен пакінуць след свайго жыцця для

нашчадкаў; талент дадзены Богам, значыць, павінен быць адказным за сваю выключнасць і таленавітасць)

IV. Рэфлексія (мэта: абагульненне; вопыт, які будзе выкарыстаны ў далейшым жыцці)

Настаўнік.

- Ці супалі нашы ўяўленні пра дрэва таполю і характарыстыку імя Люцыян з характарыстыкай галоўнага героя?
- Якія рысы характару галоўнага героя будуць вызначальнымі для мяне?
- Якія рысы характару біскупа Сямашкі я адвяргаю і не прымаю ў жыцці?

V. Каменціраванне і выстаўленне адзнак.

VI. Дамашняе заданне на выбар (параўнаць раскрыццё праблемы мастака і мастацтва ў творах З.Бядулі і М.Танка; паведамленні пра знакамітых мастакоў Беларусі або Мазыра, іх манеру творчасці; пытанні падручніка)